УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
Факультэт фізічнага выхавання
Кафедра спартыўных дысцыплін
Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт
Упраўленне па фізічнай культуры, спорту і турызму
Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт
Аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму

# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ



УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
Факультэт фізічнага выхавання
Кафедра спартыўных дысцыплін
Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт
Упраўленне па фізічнай культуры, спорту і турызму
Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт
Аддзел фізічнай культуры, спорту і турызму

# ГУЛЬНІ І ЗАБАВЫ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ: ТРАДЫЦЫІ І НАВАЦЫІ

Зборнік навуковых прац

Брэст
«Альтернатива»
2012

УДК [379.8+796.035]-053.5/.81(082)
ББК 74.200.58я43
Г94

Рэкамендавана да публікацыі кафедрай спартыўных дысцыплін
Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна
(пратакол № 8 ад 26 сакавіка 2012 года)

*Рэдакцыйная калегія:*
Ул.П. Люкевіч (старшыня, Брэст), К.І. Белы (Брэст), І.І. Лосева (Мінск),
П. Мазур (Хэлм), С. Нікіцін (Седльцэ)

*Рэцэнзент:*
доктар філасофскіх навук А.С. Лапцёнак

**Гульні** і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: традыцыі
Г94 і навацыі : зб. навук. прац / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна [і інш.] ; рэдкал.: Ул. П. Люкевіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2012. – 136 с.

ISBN 978-985-521-341-4.

У зборніку змешчаны артыкулы навукоўцаў Беларусі, Польшчы і Украіны, дзе разглядаюцца праблемы культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі ў рэтраспекцыі, на сённяшні дзень і ў бліжэйшай перспектыве як тэарэтычнага характару, так і на падставе канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў, а таксама на ўзроўні аналізу працэсу трэнінгу і спартыўных спаборніцтваў.

Матэрыялы, якія надрукаваныя ў зборніку, можна выкарыстоўваць у працэсе выкладання гуманітарных дысцыплін, фармавання здаровага ладу жыцця, а таксама ў іншых формах працы па выхаванню моладзі.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за граматычную правільнасць, падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, лічбаў, цытатаў, уласных назваў, прозвішчаў, імёнаў і іншай інфармацыі.

**УДК [379.8+796.035]-053.5/.81(082)**
**ББК 74.200.58я43**

**ISBN 978-985-521-341-4**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна», 2012
© Афармленне. ПВГУП «Издательство “Альтернатива”», 2012

The article dwells on the development of the urban physical culture and sports in Belarus (XVII – the beginning of XX century). The conclusion is drawn about the efficiency of the first sport organizations activities in the country.

**Спіс літаратуры**

1. Белорусский государственный ордена Трудового Красного Знамени институт физической культуры. – Минск, 1987.

2. Вилькин, Я.Р. Летопись физической культуры и спорта Беларуси / Я.Р. Вилькин // Вестник спортивной Беларуси. – 1993. – № 1.

3. Шпилевский, П.И. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю / П.И. Шпилевский. – СПб., 1858.

4. Шыбека, З.В., Шыбека, С.Ф. Мінск: старонкі жыцця дарэвалюцыйнага горада / З.В. Шыбека, С.Ф. Шыбека. – Мінск, 1990.

УДК 796
**Ул.П. ЛЮКЕВІЧ**
Беларусь, Брэст, УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»

## ПРЫНЦЫПЫ FAIR PLAY У ПРАЦЭСЕ АЛІМПІЙСКАЙ АДУКАЦЫІ І ФАРМАВАННЯ КУЛЬТУРЫ ДЗЯЦЕЙ І МОЛАДЗІ ПРАЗ СПОРТ

### Уводзіны

Паняцце Fair play, якое інтэрпрэтуецца ў большасці выпадкаў як «сумленная і высакародная гульня», – на самой справе з'яўляецца даволі складаным палажэннем: яно ўключае і ўвасабляе шмат якія фндаментальныя каштоўнасці, што маюць важнае значэнне не толькі для спорту, але і для штодзённага жыцця. Найбольш распаўсюджанымі характарыстыкамі Fair play з'яўляюцца такія, як павага, сяброўства, team spirit (камандны дух), справядлівасць, адмова ад допінгу, выкананне афіцыйных і «няпісаных» правілаў, роўнасць, інтэграцыя салідарнасць, талерантнасць, радасць і асалода ад спартыўнай барацьбы. Такі падыход дазваляе згрупаваць названыя нормы і патрабаванні ў адмысловыя прынцыпы, якія сталі дамінантнымі ў сучасным спорце. Менавіта гэтым абумоўлены іх уплыў на працэс алімпійскай адукацыі і фармавання культуры дзяцей і моладзі праз спорт.

Пад час спаборніцтваў кожны спартовец незалежна ад ягонай волі вымушаны выконваць правілы правядзення спаборніцтваў. Але існуюць яшчэ так званыя «няпісаныя» правілы, выкананне якіх становіцца неабходнасцю, таму што сумленная і высакародная гульня патрабуе безумоўнай павагі да суперніка, партнёраў па камандзе, арбітраў, трэнераў, публічнасці, – іншымі словамі, да ўсіх тых суб'ектаў дзейнасці, якія так ці інакш маюць дачыненне да спорту. Разам з тым канкурэнцыя зусім не выключае сяброўскіх адносінаў. Наадварот, яна ў шэрагу выпадкаў нават упрыгожвае суперніцтва, што ў канчатковым выніку надае спартыўнай дзейнасці дадатковую прывабнасць. У сістэме спартыўнай дзейнасці асобныя атлеты вызначаюцца даволі часта за кошт асабістых уменняў і якасцяў, фізічнай сілы і адметных рысаў характару. Разам з тым праявы індывідуальных здольнасцяў у складзе каманды дазваляюць у шмат большай ступені адчуць смак перамогі. Менавіта ў камандных спаборніцтвах фармуецца няўлоўнае звонку адчуванне «team spirit», ці «ка-

манднага духу», што з'яўляецца найважнейшым паказальнікам у барацьбе за першынство прыкладна роўных па сілах супернікаў. Заўсёды неабходна падтрымліваць адзін аднаго дзеля ўзаемнага аб'яднання пачуццяў, мэтаў і мараў. Такі падыход несумненна з'яўляецца прадуктыўным на шляху да поспеху.

**Асноўная частка**

Паняцце перамогі ў спорце не можа быць увасоблена толькі і выключна ў выніку. Вынік не павінен пераважаць абсалютна і спаборніцтва не павінна праходзіць толькі дзеля самаго выніку. Перамога павінна дасягацца не толькі згодна з правіламі гульні, але таксама ў адпаведнасці з выкарыстаннем дапушчальных і сумленных сродкаў. Кожны спартовец, які выкарыстоўвае фармакалагічныя сродкі, падманвае і самаго сябе і ўсіх іншых. Той, хто падманвае, руйнуе гульню. Кожны індывід, які руйнуе гульню, не павінен удзельнічаць у ёй. Сутнасць спорта праяўляецца ў спаборніцтве, якое характарызуецца аднолькавымі варункамі для ўсіх удзельнікаў. Сумленне і адпаведнасць галоўным маральным прынцыпам з'яўляюцца важнейшымі паказальнікамі высакароднай гульні. А той факт, што спорт як такі мае вялікае значэнне ў сістэме фармавання этычных структураў грамадства, жыццёва важны ў імкненні стаць сапраўдным чэмпіёнам.

У спорце часта прыходзіцца сутыкацца з такімі сітуацыямі, калі атлеты не пагаджаюцца з тымі ці іншымі рашэннямі. Але падпарадкаванне правілам гульні і рашэнням арбітраў развівае ў спартоўцаў пачуццё самакантролю, не дае магчымасці дэманстраваць негатыўныя эмоцыі ў навакольным асяроддзі. У рэшце рэштаў менавіта такая лінія паводзінаў можа выявіцца ў якасці вырашальнага фактару, калі справа датычыцца перамогі альбо паразы. Сапраўдныя чэмпіёны дапамагаюць адзін другому, таму што яны добра ведаюць, што ў кожны момант могуць трапіць у складанае становішча, дзе будзе патрэбная дапамога з боку іншай асобы. Спорт далучае спартоўцаў да калектыўных намаганняў, якія дэманструюць чалавечую дасканаласць.

Барон П'ер дэ Кубертэн, бацька сучасных Алімпійскіх гульняў, звяртаў некалі ўвагу на тое, што самым важным элементам спартыўнай барацьбы з'яўляецца не канчатковы трыўмф, а такая важная сутнасная характарыстыка спаборніцтваў як сам працэс змагання за перамогу. Спаборніцтва можа трактавацца як нешта сур'ёзнае, але нават у гэтым выпадку трэба атрымліваць ад яго радасць і задавальненне, і ніколі не адкідваць з памяці тое, што спаборніцтва – гэта толькі гульня, – нават у самыя напружаныя моманты спартыўнай дзейнасці.

Паняцце справядлівасці з'яўляецца адным з тых, якія ўтвараюць структурную сістэму нашага грамадства і спорту ў прыватнасці. Калі правілы гульні пачынаюць ігнаравацца, парушаецца сам дух спаборніцтва, гульня губляе сэнс: немагчыма суперніачаць з тымі, хто руйнуе спорт. Сумленная і высакародная гульня заўсёды застаецца галоўнай і істотнай часткай далучанасці, заахвочвання і развіцця чалавечай асобы ў жыцці і спорце. Яна адначасова фармуе пачуццё цярпімасці і павагі да іншых людзей. Гэта дазваляе аб'ядноўвацца ў грамадстве і выяўляць сэнс узаемадзеянняў. Сумленная і высакародная гульня ў спорце здольная ствараць надзеі, выклікаць гонар за прыналежнасць да адпаведных этнасу і народу, інтэгравацца чалавечай супольнасці там, дзе нацыянальнасці, палітычныя плыні, рэлігіі і культуры часта падзяляюцца. Супрацоўніцтва на падставе сумленнай і высакароднай гульні становіцца ўсё больш важным аспектам функцыянавання сучаснага грамадства. Гэта вызначае ключавую ролю Fair play як сродка, які паляпшае якасць жыцця і чалавечага дабрабыту [гл. больш падрабязна: 5].

Разам з тым спорт бесперапынна вымушаны змагацца за свае галоўныя ідэалы і мэты. Напрыклад, ужо працяглы час допінг застаецца вялікай пагрозай для сучаснага спорту. Ужыванне сродкаў стымуляцыі не толькі прафесіяналамі, але і спартоўцамі-аматарамі, стварае

небяспеку для грамадскага здароўя і змушае прымаць меры бяспекі, у тым ліку нават ў фітнэс-клубах. Барацьба з допінгам і санкцыі за ягонае ўжыванне застаюцца ў кампэтэнцыі спартыўных арганізацыяў і дзяржаўных урадаў, асабліва гэта адносіцца да краінаў Еўрапейскага саюза. Еўрапейская камісія ў сваім камунікаце да Еўрапейскага парламенту, Рады, Еўрапейскага сацыяльна-эканамічнага камітэту і Рэгіянальнага камітэту падкрэслівае, што падтрымлівае барацьбу з допінгам, а таксама адзначае тую важную ролю, якую выконвае ў гэтым накірунку Сусветнае антыдопінгавае агенцтва (WADA) [гл.: 6, 4-5].

Спорт у сістэме чалавечай дзейнасці рэалізуецца ў самых разнастайных варыяцыях. Прафесійны спорт, аматарскі спорт, спорт для ўсіх і камерцыйны спорт – гэтыя структурныя элементы выказваюць найбольш шырокія плыні ягонага развіцця ў грамадстве, але да іх можа далучацца шэраг іншых накірункаў: спорт – для адпачынку, спорт – для здароўя, спорт – для забавы, спорт – для экстрэмалаў, спорт – для інвалідаў і г. д. Існуе шмат разнастайных спосабаў заняткаў спортам. Адна асоба з пачуццём глыбокай задаволенасці скача з парашутам, іншыя людзі займаюцца бодзібілдынгам. Спартыўныя практыкаванні выяўляюцца выдатным адказам на заклікі сучаснага грамадства адносна гарманічнага паяднання такіх спецыфічных працэсаў, як, з аднаго боку, «здыманне» псіхафізіялагічнага прыгнёту ў форме стрэсу, які звязаны, напрыклад, з адметнасцямі прафесійнай дзейнасці, і, другога, - аднаўлення фізічнай і інтэлектуальнай актыўнасці чалавечага арганізма. Нават трансляцыі спартыўных спаборніцтваў па тэлебачанні выклікаюць сапраўдныя эмоцыі ў гледачоў, якія знаходзяцца далёка па-за межамі ад той падзеі, што адбываецца на стадыёне. Па вялікім рахунку спорт з'яўляецца віртуальным адбіткам чалавечага жыцця, дзе ўсё нашмат больш прыгожа і калярова, чым у рэаліях. Fair play у дадзеным выпадку толькі дакладней падкрэслівае феномен спорту, заахвочвае радасць і задавальненне ад заняткаў ім у самых разнастайных формах, выяўляе той патэнцыял, які можа быць выкарыстаны прадстаўнікамі ўсіх культураў без выключэння.

Станоўішча спорту і ягоныя суадносіны з паняццем «сумленнай і высакароднай гульні» у XXI стагоддзі нельга зразумець без сувязі з маральнымі каштоўнасцямі, такімі, напрыклад, як дабро, справядлівасць, годнасць і г. д. Прынцыпы Fair play даступныя для ўсіх і кожнага, яны замацоўваюць стратэгію і тактыку паводзінаў чалавека ў грамадстве, манеру паводзінаў атлета ў спорце. Сумленная і высакародная барацьба не мае сэнсу без павагі і цярпімасці ў адносінах да суперніка. Відавочным з'яўляецца той факт, што спаборніцтва без наяўнасці апанента ператвараецца ў фарс. Адсюль выснова: да канкурэнта ў спорце неабходна адносіцца такім чынам, каб ягоная прысутнасць надавала спартыўнаму змаганню бясконцыя імпульсы зацікаўленасці з боку гледачоў, незалежна ад таго ці святкуецца перамога, ці перажываецца параза.

Рэалізацыя прынцыпаў Fair play у спартыўнай дзейнасці мае за мэту фармаванне станоўчага ўспрымання дадзенага віду сацыяльнай актыўнасці. У такім разе гэта зацвярджаецца ў атрыманні радасці і асалоды ад самаго ўдзелу ў спаборніцтвах, калі задавальненне прыносіць толькі такі вынік, які здабыты ў сумленным змаганні безадносна таго, што гэта – перамога ці параза.

На жаль у практыцы спартыўных спаборніцтваў не так часта размова ідзе пра «сумленную і высакародную барацьбу». Нашмат больш увага надаецца разнастайным скандалам, якія адбываюцца час ад часу. У сучасным спорце востра стаяць праблемы допінгавага злоўжывання, агрэсіўнай камерцыялізацыі, што негатыўна ўплывае на традыцыйныя нормы маралі і педагагічную мадэль спорту. У выніку дэвіянтныя паводзіны здараюцца ўжо на ўзроўні дзіцячых спаборніцтваў, якія трапляюць пад уплыў практыкі ігнравання правілаў і дамінавання брутальнасці, агрэсіўных паводзінаў гледачоў, гіпертрафіраванага павелічэння ролі і значэння сродкаў масавай інфармацыі.

Згодна з Дэкларацыяй Міжнароднага камітэту Fair play «Спорт і Fair play у XXI стагоддзі» вызначаюцца пяць галоўных элементаў, якія павінны быць прынятыя пад увагу, асабліва ў тым выпадку калі робіцца іх экстрапаляцыя адносна падставовых падыходаў да праблемы выхавання моладзі праз спорт, у прыватнасці алімпійскага выхавання і асабістай культуры. Першае, з чаго неабходна пачынаць, - гэта ўсведамленне таго, што ў кожным аспекце спартыўнай дзейнасці не павінна заставацца месца гвалту, а таксама расізму, ксенафобіі, рэлігійнай нецалерантнасці і г. д. Другі элемент утрымліваецца ў тым, што ўсталяванне і захаванне правілаў надае спорту яго глабальны статус: правілы, хоць і з'яўляюцца мабільнымі і дынамічнымі, змяняюцца не ў залежнасці ад злоўжыванняў і акалічнасцяў, якія адбываюцца па-за межамі спорта. Трэці складальнік мае адносіны да паняцця «павага», якое інтэрпрэтуецца праз узаемаадносіны людзей у спорце паміж сабой, што ў заключным выніку дэманструе ўнікальныя магчымасці дадзенага віду сацыяльнай актыўнасці незалежна ад таго ці павага праяўляецца ў сціплым прыватным дзеянні, ці праз зносіны міжнароднага ўзроўню. Чацвёртае палажэнне непасрэдна звязваецца з аховай здароўя як самаго атлета, так і ягоных партнёраў па камандзе, а ў больш шырокім успрыманні распаўсюджваецца на ўсіх тых асобаў, якія так ці інакш звязаныя са спортам. Нарэшце, пятае: роўныя магчымасці (шанцы), што на практыцы азначае стварэнне і гарантыю такіх варункаў, якія перад, пад час і па заканчэнні спартыўнага адзінаборства павінны быць аднолькавымі для ўсіх. Толькі спалучэнне гэтых названых элементаў магчыма ў найбольш поўным падыходзе ахарактарызаваць прынцыпы Fair play [гл.: 4].

Аднак апошнім часам маральная праблематыка ў спорце пачынае шырока дыскутавацца ў сродках масавай інфармацыі ў дачыненні да ўжывання допінгу. Атлеты, якія падпадаюць пад адпаведныя артыкулы WADA, атрымліваюць розныя тэрміны дыскваліфікацыі, што часам уваходзіць у супярэчнасць з законамі звычайнай юрыспрудэнцыі. У такім кантэксце можа разглядацца справа іспанца Альберта Кантадора, які спецыялізуецца ў велагонках і фактычна атрымаў забарону займацца прафесійнай дзейнасцю [гл.: 3].

**Высновы**

Сучасны спорт стварае вялікія магчымасці для станоўчага ўплыву на выхаванне дзяцей і моладзі. Адным з найважнейшых аспектаў у гэтым працэсе з'яўляецца фармаванне ўстойлівых маральных стэрэатыпаў, што за пасярэдніцтвам адукацыі распаўсюджваюцца ў сістэме вышэйшай школы [гл.: 1; 2; 8]. Гэта дазваляе ўжо ў бліжэйшай перспектыве выкарыстаць патэнцыял глабалізацыйных трэндаў дзеля пабудовы больш спакойнага міру, узаемнага паразумення, сяброўства, салідарнасці і Fair play [гл.: 7, 10]. Дзякуючы такому падыходу ствараюцца ўмовы для крэатыўнага пераасэнсавання састарэлага ўяўлення адносна месца і ролі спорта ў функцыянаванні чалавечага грамадства.

Прынцыпы Fair play маюць усё большае распаўсюджванне ў сучасным спорце. Іх прапаганда і рэалізацыя за пасярэдніцтвам адукацыйных праграмаў і сродкаў масавай інфармацыі робіць моцны ўплыў на спартоўцаў і ўсіх іншых суб'ектаў спартыўнай дзейнасці. Асабліва важным гэта з'яўляецца для сістэмы вышэйшай школы, алімпійскай адукацыі і фармавання індывідуальнай культуры атлета.

Principles Fair play have the increasing distribution to modern sports. Their propagation and realization by means of educational programs and mass media have strong influence on sportsmen and all other subjects of sports activity. Especially important it is for system of the higher school, Olympic education and formation of individual culture of the athlete.

**Спіс літаратуры**

1. Люкевіч, У. Fair Play: тэорыя і практыка. – Берасьце: Выдавецтва С. Лаўрова, 1998. – 188 с.

2. Люкевіч, Ул. Спартыўная этыка: навучальны дапаможнік для студэнтаў факультэта фізічнага выхавання. – Брэст: Б.в., 2007. – 120 с.
3. Прессбол. – 2012. – № 22 (3010). – 09 февраля.
4. Declaration «Sport and Fair Play in the 21st Century» // http://www.fairplayinternational.org/fairplay/the-essence-of-fair-play, дата доступу 11.01.2012.
5. http://www.fairplayinternational.org/fairplay/the-essence-of-fair-play, дата доступу 11.01.2012.
6. Komisja Europejska. Bruksela, dnia 18.1.2011. KOM (2011). 12 wersja ostateczna. Komunikat Komisji do Parlamentu Europejskiego, Rady, Europejskiego Komitetu Ekonomiczno-Społecznego i Komitetu Regionów. Rozwijanie europejskiego wymiaru sportu. – S. 4–5.
7. Olympic Charter. – Lausanne: International Olympic Committee, 2011. – 103 p.
8. Przyluska-Fiszer, A., Misiuna, B. Etyczne aspekty sportu. – Warszawa: Wydawnictwo AWF, 1993. – 155 s.

УДК 316.723:796.073(438)

**А. АНТАС, С. НИКИТИН**
Польша, Седльце, Университет естественных и гуманитарных наук

## СУБКУЛЬТУРА ПСЕВДОБОЛЕЛЬЩИКОВ В ПОЛЬШЕ. АНАЛИЗ ЯВЛЕНИЯ ХУЛИГАНСТВА НА СТАДИОНАХ

В последние годы в Польше отмечен высокий процент молодых людей, участвующих как болельщики в разнообразных спортивных мероприятиях. Исследователи спорта, анализируя социальный контекст спортивных соревнований и зрелищ, все чаще задумываются и ищут ответ на вопрос: что приводит к тому, что именно молодые люди так охотно включаются в роль болельщика, и в какой степени такая форма досуга влияет на агрессивное инфра-спортивное асоциальное поведение, выходящее за рамки правил спортивной деятельности. Как психологи, так и социологи, объясняют агрессивное поведение во время спортивных зрелищ, например, чувством анонимности, а вслед за этим, безнаказанности болельщиков, которые не придерживаются общепринятых норм поведения. В толпе также имеет место рассеяние ответственности. Люди совершают поступки, которых не сделали бы в одиночку [28, 16]. Ч. Матусевич заметил, что социальные механизмы регулируются процессами и состояниями спортивного зрелища, вытекающими из факта контактов между социальными объектами (большие человеческие группы, учреждения, идеи). Человек – существо общественное, а его обыденной средой обитания является общество, поэтому механизмы социальной регуляции всевозможных процессов, в том числе также спортивного зрелища, являются стержнем этой регуляции. Эмоции, переживаемые болельщиками, вызваны многими факторами. Ведь это эмоции современного индивида, который накапливает в своих переживаниях и биологическое, и социальное, и культурное [18, 28]. Кроме того, многие исследователи спорта подчеркивают, что трибуны спортивных объектов являются местами, в которых можно разрядить ежедневные эмоции, различные комплексы и фрустрации. Сами болельщики подчеркивают при этом, что спортивное мероприятие – удобный случай пережить огромные эмоции, и возможность хотя бы на миг прервать ежедневную монотонность [8, 21].

Следует ответить здесь на вопрос, кто же зритель, участник спортивных зрелищ? Согласно мнению П. Петровского классификация зрителей спортивных мероприятий трояка. К первой группе относятся «зрители-потребители» (англ. consumption oriented spectators)